Пролетары ўсіх краёў, злучайцеся!

Чырвоная зьмена

№ 206 (1173) | Субота, 6-га верасьня 1930 г.

Штодзённая газэта рабоча-сялянскай моладзі
Орган ЦК ЛКСМБ

Умовы падпіскі:
1 месяц . . . 30 кап.
3 месяцы . . . 90 „
6 месяцаў . . . 1 р. 80 „
1 год . . . 3 р. 30 „

Адрас рэдакцыі: Менск, вул. Карла Маркса, 38
Тэлефоны: рэдактара—7-25, сэкратарыят—12-19.
Адрас канторы: Комсамольская 25, тэлеф. № 903.

Год выданьня X.

Кошт асобнага №—2 кап.

Прадвыбарная кампанія праходзіць з вялікім посьпехам

У кампаніі прымае ўдзел Макс Гельц

БЭРЛІН, 4. Прадвыбарная кампанія Нямецкай компартыі праходзіць з вялікім посьпехам.

У кампаніі ў сучасны момант удзельнічае Макс Гельц, які вярнуўся з СССР. Гельц выступіў на грандыёзным мітынгу, наладжаным МОПР'ам у адным з рабочых кварталаў Бэрліна.

Прамова Гельца неаднократна перарывалася бурнымі овацыямі.

З асаблівым захапленьнем была спаткана тая частка прамовы, у якой Гельц расказваў аб сваіх уражаньнях аб СССР і гэроічнай барацьбе савецкіх пролетараў на фронце социялістычнага будаўніцтва.

ЗАУТРА — XVI МЮД

Комсамольцы! Працоўная моладзь! Усе—на дэмонстрацыю!

ДЗЕНЬ МЮД АДЗНАЧЫМ ЯШЧЭ БОЛЬШ УПАРТЫМ НАСТУПАМ НА ЎСІХ ФРАНТОХ СОЦЫЯЛІСТЫЧНАГА БУДАЎНІЦТВА

ДНЁМ УДАРНІКА сустрэнем трэці год пляну вялікіх работ

Пастанова Прэзыдыуму УсеЦСПС

Канчаецца другі год пяцігодкі, год вялікага пералому, які падняў магутную хвалю працоўнага ўздыму рабочых мас, на справе ажыцьцяўляючых свой лёзунг „пяцігодку ў чатыры гады“.

Побач з буйнейшымі посьпехамі ў разьвіцьці соцыялістычнай прамысловасьці, дасягнутымі ў бягучым гаспадарчым годзе, прэзыдыум УсеЦСПС адзначае, што ў ходзе выкананьня прамфінпляну бягучага году выявіўся шэраг сур'ёзных прарываў, якія ставяць пад пагрозу пасьпяховае сканчэньне гаспадарчага году і ажыцьцяўленьне бальшавіцкіх тэмпаў індустрыялізацыі ў трэцім годзе пяцігодкі. Галоўнай прычынай гэтых прарываў прэзыдыум УсеЦСПС лічыць няўменьне стаць на чале і арганізаваць растучы працоўны ўздым рабочых мас. Між тым, у ходзе разгортваючагася соцыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва, якая забясьпечыла рашучыя посьпехі рабочае клясы на асноўных вучастках соцыялістычнага будаўніцтва, ініцыятывы мас, высунуты і правераны на вопыце конкрэтныя формы барацьбы за выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну (грамадзкі буксір, скразныя ўдарныя брыгады і інш.).

Новым буйнейшым крокам, які забясьпечвае непасрэдны ўдзел шматмільённых мас у соцыялістычным будаўніцтве, зьяўляецца сустрэчны прамфінплян, высунуты рабочымі масамі ў адказ на прарывы на асобных вучастках прамысловасьці. Сустрэчны прамфінплян паказвае ўздым соцспаборніцтва на вышэйшую ступень, забясьпечвае максімальнае выяўленьне і выкарыстаньне ўсіх рэзэрваў, і вытворчых магчымасьцей соцыялістычнай гаспадаркі, ударае па карэньнях шкодніцтва і зьяўляецца лепшым адказам усім панікёрам і опортуністым.

У мэтах мобілізацыі ўсіх сіл рабочае клясы на ліквідацыю прарываў у выкананьні прамфінпляну бягучага году, максымальнага выкарыстаньня ўсіх форм соцспаборніцтва і найлепшай падрыхтоўкі рабочых мас да арганізаванай сустрэчы трэцяга рашучага году пяцігодкі, Прэзыдыум УсеЦСПС пастанаўляе: 1) сустрэчу трэцяга году пяцігодкі адзначыць арганізацыяй Усесаюзнага дня ўдарніка—1 кастрычніка 1930 г.

Усесаюзны дзень ударніка, які арганізуецца на ўсіх фабрыках, заводах, шахтах, транспарце, ва ўстановах, коопэрацыі, с а в г а с а х і колгасах, павінен прайсьці пад знакам самай шырокай мобілізацыі мас на пасьпяховае сканчэньне другога году пяцігодкі, на палепшаньне якасьці работы, на рашучую барацьбу з рэшткамі працоўнай расхлябанасьці, цякучасьцю, дэзорганізацыяй, перашкаджаючых разгортваньню падрыхтоўкі да 3 году пяцігодкі. Дабіцца рашучага пералому ў рабоце коопэрацыйных і забясьпечваючых органаў і ўзмацненьня актыўнасьці профсаюзаў у лепшай арганізацыі справы рабочага забясьпечаньня.

2) Усесаюзны дзень ударніка, зьяўляючыся днём усеагульнай мобілізацыі актыўнасьці працоўных на поўнае выкананьне распрацаванага пры непасрэдным удзеле шырокіх рабочых мас прамфінпляну трэцяга году пяцігодкі (сустрэчны прамфінплян), павінен выклікаць прыліў новых атрадаў рабочае клясы ва ўдарны рух, прызыў ударнікаў трэцяга году пяцігодкі, замацаваць і зрабіць уласнасьцю кожнага прадпрыемства правераныя вопытам мас новыя вышэйшыя формы соцспаборніцтва (грамадзкі буксір, скрозныя брыгады і г. д.), забясьпечыць масавае заключэньне дагавораў па соцспаборніцтву паміж брыгадамі, цэхамі на падставе новых паказчыкаў, якія выцякаюць з сустрэчнага прамфінпляну і прэміяваньня лепшых прадпрыемстваў і ўдарнікаў, з посьпехам выканаўшых прамфінплян другога году пяцігодкі.

3) прэзыдыум УсеЦСПС падкрэсьлівае, што верасень месяц павінен быць максымальна выкарыстаны ўсімі саюзнымі арганізацыямі дзеля рашучага падцягваньня адстаючых у выкананьні прамфінпляну прадпрыемстваў, цэхаў, брыгад, асабліва па вугалю, мэталю і транспарту, шляхам арганізацыі грамадзкага буксіру, скрозных брыгад, разгортваньнем на прадпрыемствах збору і рэалізацыі рабочых прапаноў, вынаходніцтва і г. д.

Прэзыдыум УсеЦСПС заклікае рабочых, інжынэрна-тэхнічных працаўнікоў і ўсіх працоўных да напружаньня ўсіх сіл для пасьпяховага завяршэньня другога году пяцігодкі і падрыхтоўкі новага гаспадарчага году.

—Ужо 10-12 год як я лічу неабходным прызнаньне СССР

„У гэтай краіне,—піша сэнатар Уілер,—зараз ідзе вялізарнейшае ў сьвеце прамысловае будаўніцтва“

НЬЮ-ЁРК, 3. Член дэлегацыі амэрыканскіх сэнатараў, вучоных журналістаў і палітычных дзеячоў, сэнатар Уілер, які зьвярнуўся з СССР, даў прадстаўнікам друку інтэрвью, у якім настойвае на прызнаньні СССР.

— Ужо 10-12 год як я лічу неабходным прызнаньне СССР,—заявіў Уілер. І тое, што я ўбачыў цяпер у СССР, нікольні не зьмяніла майго пункту погляду.

СССР,—сказаў Уілер,—можа стаць буйнейшым тэндэнцыяльным рынкам у сьвеце для амэрыканскіх тавараў, рынкам значна больш вялікім, чым паўднёвая Амэрыка і Кітай. Аднак Савецкаму Саюзу неабходна прадставіць доўгатэрміновыя крэдыты. Мы павінны заключыць з ім гандлёвы дагавор.

Ні прызнаньне СССР, ні заключэньне з ім гандлёвага дагавору зусім не азначае, што мы павінны адобрыць яго палітычны лад.

Уілер далей указаў, што ўсе амэрыканскія журналістыя і інжынэры, якія знаходзяцца ў СССР, спачувальна адносяцца да прызнаньня. Сэнатар штату Кентукі Барклей, таксама прымаўшы ўдзел у дэлегацыі, заявіў:

— Калі ў Расіі будзе і далей існаваць устойлівы ўрад, ПАЗШ павінны задумацца над сур'ёзным пытаньнем аб яе прызнаньні. Тое, што я ўбачыў, аказалася для мяне вялікай нечаканасьцю. У адносінах да СССР неабходна адкінуць усе ўстарэлыя забабоны. У гэтай краіне зараз ідзе вялізарнейшае ў сьвеце прамысловае будаўніцтва. У час майго наведваньня СССР я атрымаў весткі, якія зьмянілі ўсе мае ўяўленьні аб ім.

Рэволюцыйны прадвыбарны сход компартыі Нямеччыны

24 жніўня на стадыёне ў Нейкельне (раён у Бэрліне) комуністычная партыя арганізавала грандыёзны сход, на якім прысутнічала звыш 60 тысяч чалавек.

Сход меў характар вялікага пролетарскага сьвята і суправаджаўся прадвыбарнымі прамовамі, партыйнымі практыкаваньнямі, дэмонстрацыйным абвяшчэньнем аб выхадзе з царкоўнай абшчыны і масавай клятвай вернасьці рэволюцыі.

У надзвычайна добрай прамове кандыдат комуністычнай партыі Гейнц Нейман высунуў лёзунг барацьбы за адзінства рабочае клясы пад сьцягамі комуністычнай партыі.

Стадыён быў на вялікай адлегласьці акружан паліцэйскімі патрулямі, паліцыяй на аўтамабілях і коннай паліцыяй.



На здымку: Дэмонстранты накіроўваюцца на стадыён. Калёна рабочых, дэмонструючых супроць соцыял-дэмократаў, тав. выступаючых за пабудову броняносцаў.

„Проэкт“ Чан-Кай-шы аб падзеле Кітаю

ПАРЫЖ, 4. Шанхайскі корэспондэнт агенцтва Індопацыфісты паведамляе, што Чан-Кай-шы быццам бы ўступіў у перагаворы з Чжан-Сюэ-лянам, прапануючы апошняму падзяліць Кітай на шэраг буйных абласьцей—накштальт віцэ-каралеўстваў. Задачай абласных урадаў пры такім падзеле павінна стаць ахова „спэцыфічных эканамічных інтарэсаў абласьцей, на чале якіх стаяць гэтыя ўрады“.

Згодна проэкту, Пэйпін і Цянь-Цзінь павінны будуць адыйсьці да Манчжурыі.

— Прыняцьце гэтага проэкту бакамі,—заяўляе корэспондэнт,—магло-б адыграць ролю правадвер'я міру

Па думцы корэспандэнта Індопацыфісты, намечанай згодаю на адзначанай вышэй аснове тлумачыцца і той факт, што тры „манчжурскія дывізіі ўжо ўступілі ў межы вялікай зямлі, накіроўваючыся ў Цзянь-Цзінь.

2.039.702 беспрацоўных у Ангельшчыне

ЛЁНДАН, 4. Па афіцыйных даных, лік зарэгістраваных беспрацоўных у Ангельшчыне на 25-ае жніўня складаў 2 мільёны 39 тыс. 702, г. зн. на 21 тысячу 745 чал. больш, чым на мінулым тыдні.

У параўнаньні з тым-жа пэрыодам мінулага году лік беспрацоўных павялічыўся на 833899 чалавек.

І-шы Усебеларускі зьезд па політэхнічнай асьвеце

15-га верасьня ў гор. Менску адчыняецца І-шы Усебеларускі зьезд па політэхнічнай асьвеце.

ПАРАДАК ДНЮ:

1. Рэконструкцыя нар. гаспадаркі і політэхнічнае выхаваньне.
2. Формы і мэтады працы політэхнічнай школы.
3. Роля ФЗС у падрыхтоўцы кадраў.
4. Падрыхтоўка масавых колгасных кадраў і ШКМ.
5. Політэхнізацыя школы і роля ў ёй профсаюзаў.
6. Сэкцыі па прапрацоўцы програм.

Старшыня арг. Камітэту Наркомасьветы БССР А. ПЛАТУН.
Сэкратар НКА СІНІЦКІ.

УСЕ НА ДЭМОНСТРАЦЫЮ

Сёньня а 6-ай гадзіне ўвечары

ДЭМОНСТРАЦЫЯ ПРАЦОЎНАЙ МОЛАДЗІ

г. Менску, прысьвечаная XVI МЮД'у.

Збор ячэек каля памяшканьняў райкомаў ЛКСМБ

Ячэйкі прыходзяць са сьцягамі, факеламі з оркестрамі.

Пасьля дэмонстрацыі—масавая інтэрнацыянальная інсцэніроўка ў садзе „Профінтэрн“

Колгасна-вытворчы паход комсамолу

Восень стукае ў дзьверы

Аднак у практычнай падрыхтоўцы да сяўбы мясцовыя, партыйныя савецкія і колгасна-коопэрацыйныя організацыі ня прынялі дастатковых мер, якія забясьпечвалі-б пасьпяховае ажыцьцяўленьне задач, пастаўленых перад асеньняй пасяўной кампаніяй.

(З пастановы Бюро ЦК КП(б)Б)

Комсамольскія ячэйкі, рапа туйце зьезду комсамолу не рэзолюцыямі, а конкрэтнымі справамі вашай барацьбы за бальшавіцкае прав дзеньне падрыхтоўкі да асеньняй сяўбы

Усім РК і колгасным і савгасным ячэйкам ЛКСМБ

У „Комсомольской Правде" за № 214 ад 30-VIII г. г. быў зьмешчаны рапарт колгаснай ячэйкі ЛКСМБ „Расьсьвет Пераможца" (Бабруйшчына), які паказвае вузоры бальшавіцкіх тэмпаў работы. ЦК ЛКСМБ лічыць неабходным працоўну рапарту комсамольскай ячэйкі колгасу „Расьсьвет Пераможца" на ўсіх саюзных сходах савгаска-колгасных ячэек з мэтай перанясеньня іх вопыту ў рабоце па ўсёй організацыі.

Адначасова ЦК ЛКСМБ заклікае савгаскія і колгаскія ячэйкі, якія рыхтуюцца да IX зьезду УсеЛКСМ і X ЛКСМБ, падзяліцца посьпехамі ўдзелу ў соцыялістычнай будоўлі ў форме данясеньняў, рапартоў на старонках газэты „Чырвоная Зьмена" і „Юнгер Арбэйтэр", ускрываючы разам з гэтым слабыя бакі сваёй работы.

Райкамолам прапануецца аказаць у гэтым напрамку дапамогу колгасна-савгаскім ячэйкам.

Сэкратар ЦК ЛКСМБ ПАЛЯКОЎ.

Абяцанкі засталіся... абяцанкамі

Колгас „Пахар", Капыльскі р-н, займае 300 дзесяцін зямлі. Працоўных адзінак разам з падлеткамі 18 чалавек. У час правядзеньня ўборачнай кампаніі колгасьнікі разгарнулі соц. спаборніцтва, організавалі ударныя брыгады. Працавалі дружна. Уборка скончана з посьпехам. Зараз колгас рыхтуецца да асеньня-пасеўнай кампаніі.

Капыльская трактарная калёна абяцала колгасу „Пахар" заараць 24 гэктары пад азімы, але гэтыя абяцанкі засталіся толькі абяцанкамі. Адведзены кавалак зямлі яшчэ не зааraны.

М. В.

У рэлігійнае сьвята ня вышлі на работу

У в. Шалібаўцы, Буда-Кашалёўскага раёну, організаваны колгас. Першымі ў колгас уступілі комсамольцы.

Некаторыя комсамольцы вельмі дрэнна адносяцца да працы ў колгасе. Калі старшыня прапанаваў комсамольцам 28 жніўня выехаць на поле араць, бо колгас „Чырвоны Пахар" яшчэ не ўзараў свайго вучастку зямлі, **дык комсамольцы ад гэтай прапановы адмовіліся. У гэты дзянь якраз было рэлігійнае сьвята.**

Некаторыя комсамольцы яшчэ і дагэтуль не абагулілі свае сельскагаспадарчыя машыны.

Рудкоў.

Новыя машыны валяюцца пад дажджом

Мсьціслаўскае с-г. таварыства не зьвяртае аніякай увагі на падшуканьне належных складаў для прыбыўшых с-г. машын. Цяпер яны валяюцца на двары пад дажджом і іржавеюць. Некаторыя машыны для працы ўжо нягодны. Новыя машыны прыходзіцца везьці ў майстэрню спэцыяльна для рамонту.


Усё гэта творыцца на вачох комсамольскай ячэйкі, але яна як-бы і ня бачыць.

Н. І.

Гатунковае насеньне колгасам і адзіналічнікам

Савгас Дукора мае збожжавы ўхіл, савгас забясьпечан гатунковым добраякасным жытам. Для правядзеньня асеньняга севу савгас абмяняе дробнае насеньне ўсім колгасам і адзіналічнікам—бедняком і серадняком—на гатунковае.

М. Шатэрнік.



Элеватар, набудаваны ў г. Воршы, які ўмяшчае 1 мільён пудоў збожжа.

Рыхтуюцца... маруднымі тэмпамі

Ужо тыдзень, як у колгасе імя „16-ці партызан" скончылі жніво. І на працягу ўсяго гэтага часу дзьве жняяркі стаяць пасярод м. Дукоры бяз жаднай карысьці. А ў колгасе „Праца" недахапае ўборачных машын. Колгас не падрыхтаваў машын па ачыстцы насеньня. Вельмі марудна рыхтуюцца да асеньняй сяўбы.

Ц.

Дапамаглі ўбраць ураджай

Уборка ў большасьці колгасаў Бялыніскага р-ну прайшла здавальняюча. На дапамогу некальлкім адстаючым колгасам РК ЛКСМБ мобілізаваў дзьве брыгады з комсамольцаў і рабочай моладзі. Першая брыгада, у колькасьці 25 асоб, выехала на працу ў колгас „Домбаля" тэрмінам на 4-5 дзён. Другая выехала ў савгас „Шлях Селяніна" на такі-ж тэрмін.

23-га жніўня комсамольскія організацыі наладзілі суботнік у колгасе „Чырвоны Барэц". Вынікі надзвычайна добрыя. Колгасьнікі дзякуюць комсамольцам за іх дапамогу ў працы.

Бядулейка.

Не пачалі падрыхтоўкі

Колгас „Чырвоная Бярэзіна" яшчэ не пачаў падрыхтоўкі да асеньняй пасеў-кампаніі. Партыйныя і комсамольскія ячэйкі яшчэ нічога конкрэтнага не зрабілі ў гэтым напрамку. Уборачная кампанія таксама яшчэ ня скончана. На полі, дзе трэба сеяць жыта, яшчэ ня прыбраны ўраджай.

Палын.

Падрыхтавалі насеньне

КСТУ Бардзінскага сельсавету, Заслаўскага р-ну, ужо падрыхтаваў насеньне да асеньня-пасеўнай кампаніі.

Яшчэ месяц таму назад КСТУ склікаў комсамольскі актыў і беспартыйную моладзь, якія за адзін дзень змалацілі ўсё жыта і ачысьцілі яго ад мякіны, перагнаўшы на сартыроўцы.

Н. Сумны.

Толькі абгаварылі

Доўга абгаварвалі на комсамольскай ячэйцы К-Борскага с-с, Бярэзінскага р-ну, падрыхтоўку да асеньняй сяўбы. Але на практыцы нічога конкрэтнага не зрабілі. Ёсьць адзін трыер ды і той не падыходзіць да ачысткі насеньня. З 100 пудоў жыта выходзіць усяго 10 пудоў чыстага.

Юнкор Міхейцкі.

Улічыць вурокі Менску і Віцебску

Выканаць дырэктыву ЦК УсеЛКСМ

Забясьпечыць найбольшы ўдзел мас комсамольцаў у ліквідацыі акруг і акругкомаў ЛКСМБ

Пастанова Бюро ЦК ЛКСМБ ад 28-VIII-30 году

Заслухаўшы інформацыю т. Гайдукевіча і Гуткіна аб ходзе ліквідацыі акруг, бюро ЦК ЛКСМБ прызнае, што праведзеная ліквідацыя 3-х акруг (Менск, Віцебск, Ворша) і ход падрыхтоўчай працы па ліквідацыі астатніх акруг зусім нездавальняючы.

Ліквідацыя акруг фактычна была зьведзена да ліквідацыі апарату, недаацэнена політычнае значэньне гэтай работы, якая праходзіла і праходзіць у сучасны момант бяз удзелу шырокіх мас комсамольцаў і працоўнай моладзі.

Дырэктывы ЦК УсеЛКСМ і ЛКСМБ аб правядзеньні шырокай справаздачнай кампаніі акругкамолаў перад шырокімі комсамольскімі масамі, ня выкананы.

Бюро ЦК ЛКСМБ лічыць зусім ненормальным такое становішча, што партыйныя камітэты (Віцебск, Менск) абмежавалі комсамольскія організацыі ў справе падрыхтоўкі хуткага, чоткага правядзеньня ліквідацыі акруг як па лініі комсамолу, так і наогул абмежавалі ўдзел комсамолу ва ўсёй ліквідацыі: забаранялася склікаць пленуму АК, нарад сэкратароў РК. Адначасова зусім недапушчальна такое становішча, калі шмат якія працаўнікі акруговых апаратаў комсамолу скарыстаны не на комсамольскай рабоце. Пры яўным ігнараваньні комсамольскіх органаў, яны накіроўваліся парткамітэтамі на іншыя работы (Гомель, Віцебск, Полацак, Менск, Бабруйск), што адбілася на ўзмацненьні працаўнікамі раённых камітэтаў ЛКСМБ.

Адзначыць покуль неваладжанасьць сувязі ЦК ЛКСМБ з раённымі камітэтамі, што значна адбіваецца на чоткасьці працы раённых камітэтаў.

Выходзячы з гэтага бюро ЦК ЛКСМБ пастанаўляе:

1. Прапанаваць Гомельскаму, Магілёўскаму, Бабруйскаму, Мазырскаму і Полацкаму АК ЛКСМБ у рабоце па ліквідацыі акруг забясьпечыць удзел мас комсамольцаў, каб гэтае пытаньне было абгаворана на пленумах гаркомаў, райкомаў і ячэек. Выканаць дырэктыву ЦК ЛКСМБ аб правядзеньні справаздачнай кампаніі АК, не дапусьціўшы тых промахаў, якія меліся з боку Менскага, Віцебскага і Аршанскага АК. Правесьці ліквідацыйныя пленумы АК ЛКСМБ.

2. Лічыць неабходным склікаць сходы гарактываў комсамолу ў Менску, Віцебску, Воршы з дакладамі аб выніках ліквідацыі акруг і чарговых задачах організацыі. Дакладчыкамі вылучыць на Менскі актыў т. Гайдукевіча, Віцебскі—т. Гуткіна і Аршанскі—Лапіцкага.

3. Давесьці да ведама ЦК КП(б)Б аб тым, што АК КП(б)Б (Менск, Віцебск, Бабруйск, Гомель, Полацак і інш.), замест сапраўднага кіраўніцтва ліквідацыяй акругкомаў ЛКСМБ займаліся дробнай апекай (забарона склікаць пленумаў АК нарад сакратароў РК) і ігнараваньнем комсамольскіх камітэтаў пры разьмеркаваньні акруговых комсамольскіх працаўнікоў, якіх пасылалі бяз згоды з ЦК ЛКСМБ не на раённую комсамольскую работу, а на іншыя, што адбілася на ўзмацненьні РК ЛКСМБ комсамольскімі акруговымі працаўнікамі.

4. На чарговым бюро ЦК ЛКСМБ канчаткова зацьвердзіць разьмеркаваньне застаўшыхся комсамольскіх акруговых працаўнікоў.

5. Падрыхтаваны матар'ял Арг. Аддзелу ЦК ЛКСМБ аб прыстасаваньні апарату ЦК ЛКСМБ да непасрэднага кіраўніцтва і абслугоўваньня раённых камітэтаў з в чоткай асаблівасьцяў раёнаў унесьці на зацьверджаньне чарговага бюро ЦК ЛКСМБ.

6. Адзначыць, што пытаньне ходу ліквідацыі Акругкамолаў да апошняга часу не асьвятлялася ў газэце „Чырвоная Зьмена". Прапанаваць газэце „Чырвоная Зьмена" зараз-жа забясьпечыць асьвятленьне ходу далейшай работы па ліквідацыі акруг наогул і асабліва АК ЛКСМБ.

7. Пры прыёме ў ЛКСМБ пакуль пакінуць 3-юю катэгорыю на канчатковае зацьверджаньне ЦК ЛКСМБ. Адначасова прасіць ЦК УсеЛКСМ хутчэй вырашыць устаўныя пытаньні, зьвязаныя з прыёмам у КСМ.

Канчатковую рэкамэндацыю ўсіх катэгорый у КП(б)Б пакуль пакінуць за РК ЛКСМБ.

8. Прапанаваць усім АК ЛКСМБ забясьпечыць пасылку ўсіх комсамольцаў, якія раней працавалі ў акруговых установах, на раённую работу непасрэдна.

ЦК ЛКСМБ

КІТАЙ

Жорсткія крывавыя бai за Чанша

Урадавыя войскі пусьцілі ў ход супроць Чырвонай арміі паветраную бомбардыроўку і ўсе апошнія дасягненьні ваеннай тэхнікі

Часьці Чырвонай арміі занялі горад Поян і вядуць гэроічнае наступленьне на Чанша

ШАНХАЙ, 4. Газэта „Шэнь-Бао" паведамляе, што аддзелы кітайскай Чырвонай арміі занялі горад Поян (важны прамысловы цэнтр ва ўсходняй частцы провінцыі Цзянсі).

ШАНХАЙ, 4. Барацьба за Чанша (фортка провінцыі Хунань) уступіла ў рашаючую стадыю.

Карпусы Чырвонай арміі акружылі горад з усходняга, заходняга і паўднёвага бакоў. Ва многіх з гэтых пунктаў адбываліся жорсткія бai з урадавымі войскамі, пусьціўшымі ў ход супроць чырвонай арміі паветраную бомбардыроўку і ўсе апошнія ваенныя дасягненьні.

У некаторых мясцох чырвоныя войскі выпускалі на драцяныя загарадзі быкоў і буйвалаў, прыкрываўшых армію, якая ішла ўсьлед за імі.

Хаця афіцыйныя кітайскія крыніцы працягваюць паведамляць аб сур'ёзных паражэньнях чырвоных, не падлягае сумненьню, што Чырвоная армія абкружыла Чанша і вядзе барацьбу на подступах к гораду. 3-га верасьня ўвесь дзень адбывалася перастрэлка паміж кітайскімі канонеркамі і чырвонымі войскамі, якія занялі паўночны бераг ракі непадалёк ад Чуцзушы. Абстрэл позыцый Чырвонай арміі канонеркамі выразна чуцен у Чанша, куды ў вялікай колькасьці прыбываюць раненыя.

ПЭЙПІН, 4. Па паведамленьнях з кітайскіх крыніц, комуністычныя аддзелы стварылі вакол Чанша паўкола, радыусам у 15 кілёмэтраў. Ваенныя экспэрты лічаць, што падзеньне Чанша непазьбежна.

ПАРЫЖ, 4. Па паведамленьню шанхайскага корэспондэнта тэлеграфнага агенцтва Індопацыфісты, у Чанша пануе зараз невыабражальны хаос. „Масавыя пакараньні сьмерцю і крывавыя расправы ўлады нікольні не зьмяншаючы комуністычнай небясьпекі, толькі тэрорызуюць насельніцтва. Чырвоныя войскі, якія дзейнічаюць супроць Чанша, у параўнаньні з нанкінскімі войскамі, ствараюць уражаньне лепш організаваных і лепш дысцыплінаваных". Корэспондэнт указвае на бадай што поўны паляруш замежнага гандлю Кітаю і тлумачыць гэта тым, што „комуністыя ў даліне Янцзы блёкуюць усякія таварныя зносіны".

15-га верасьня першы Усебеларускі політэхнічны зьезд

ЗАМЕСТ ПАДРЫХТОЎКІ—ГАБІНЭТНАЯ ПЕРАПАЛКА

Ведамсьцьвенная папяровая перапалка паміж Наркамасьветы, ВСНГ, ЦСПСБ—ставіць пад пагрозу зрыву справу політэхнізацыі школ і скліканьне зьезду

Пранясем падрыхтоўку да зьезду ў шырокія працоўныя масы. Барацьбу за політэхнічную школу—ператворым у штодзённую барацьбу кожнай комсамольскай ячэйкі, кожнага заводу, фабрыкі, кожнага колгасу і савгасу

Безадкладна разгарнуць падрыхтоўку

Праз 9 дзён у Менску адчыніцца Першы Усебеларускі Зьезд па політэхнічнай асьвеце. Аб політычнай важнасьці гэтага зьезду, які павінен вызначыць шэраг конкрэтных задач і прапаноў па ажыцьцяўленьню ідэі політэхнізацыі школы, аб якой ня раз гаварыў Маркс і Ленін і аб якой з усёй чоткасьцю падкрэсьліў апошні 16 партыйны зьезд—гаварыць ня прыходзіцца.

Зьезд павінен будзе ня толькі яшчэ раз распропагандыраваць ідэю політэхнізацыі, але вызначыць задачы і шляхі, як конкрэтна перабудаваць школу на політэхнічны лад. Адсюль выцякае неабходнасьць падрыхтоўцы зьезду надаць сапраўды масавы і ўдарны характар.

Між тым на сёньня ні Наркомасьветы, ні ВСНГ, ні ЦСПСБ, ні Колгасцэнтр амаль нічога не зрабілі ў напрамку разгортваньня масавай падрыхтоўкі да правядзеньня політэхнізацыі і політэхнічнага зьезду.

Ніводная з організацый тэзісаў не выпрацавала. Пытаньні, якія будзе абгаварваць зьезд ня вынесены на абгаварэньне шырокіх рабочых і колгасных мас.

Да зьезду засталіся дні, а тым часам нікому невядома з чым мы прыходзім да зьезду. З якімі конкрэтнымі прапановамі мы яго сустракаем. Гэты дакор у першую чаргу адносіцца да органаў Нарасьветы, гаспадарчых, профэсыянальных і комсамольскіх організацый.

Трэба, каб друкуемая сёньня пастанова ЦК ЛКСМБ зараз-жа была абгаворана на комсамольскіх сходах. Кожная комсамольская ячэйка павінна быць застрэльшчыцай у падрыхтоўцы да зьезду, у зборы прапаноў да яго,

Практычнае правядзеньне політэхнізацыі школы ўпрэцца ў адсутнасьць, у першую чаргу матар'яльнай тэхнічнай базы. Кожная комсамольская ячэйка можа і ў гэтым аказаць значную дапамогу. Трэба зараз-жа пачаць выяўляць часткі і цэлыя варштаты, якія не выкарыстоўваюцца на прадпрыемствах і дабівацца перадачы іх для школ. Шляхам організацыі суботнікаў рабіць ім патрэбны рамонт, устанаўліваць на месцы, абсталёўваць цэхі для практыкі вучняў і г. д.

Шырокім абменам вопытам існуючых ужо політэхнічных фабрычна заводзкіх сямігодак і школ сялянскай моладзі мы павінны сустрэць надыходзячы зьезд. Кожная фабрычна заводзкая сямігодка і школа сялянскай моладзі павінны падагуліць вопыт сваёй работы і ўсе дасягненьні і недахопы вынесьці да зьезду на абгаварэньне грамадзкасьці праз наш друк.

Барацьба за політэхнізацыю сярэдняй школы,—гэта ня ёсьць работа адных толькі органаў Наркомасьветы. Гэта павінна стаць штодзённай барацьбой усяе рабочае клясы пад кіраўніцтвам партыі, бо барацьба за політэхнічную школу, ёсьць барацьба за пяцігодку, за комуністычнае выхаваньне кадраў.

Конкрэтныя задачы комсамольскіх ячэек у справе падрыхтоўкі да зьезду будуць заключацца ў першую чаргу ў тым, каб забясьпечыць выкананьне дырэктыў аб прымацаваньні школ сямігодак да заводаў і фабрык у горадзе, і колгасаў—у вёсцы.

Патрэбна абвясьціць бязьлітасную барацьбу як з бюрократычным супраціўленьнем гаспадарнікаў справе прымацаваньня школ да прадпрыемстваў, так і чыноўніцкім, дзялацкім адносінам да гэтай справы.

Комсамольскія ячэйкі на вытворчасьці ня трацячы і хвіліну часу абавязаны безадкладна, не чакаючы пакуль „прагрыміць гром“ самім узяцца за ажыцьцяўленьне гэтай задачы.

ЦК ЛКСМБ--абавязвае

1. У бліжэйшы час на сходах ячэек, сходах рабочых у колгасах і савгасах паставіць даклады аб політэхнізацыі і разгарнуць шырокае абгаварэньне тэзісаў да політэхнічнага зьезду. Райкомам ЛКСМБ, разам з органамі саюзаў Працасьветы, скласьці брыгады з комсамольцаў і настаўнікаў па абслугоўваньню гэтых сходаў

2. Комсамольскім організацыям, разам з органамі Наркомасьветы, прыступіць да прымацаваньня 7-годак да прадпрыемстваў, колгасаў і савгасаў і пераводу іх у ФЗС і ШКМ. Гэта работа павінна быць скончана не пазьней 13 верасьня.

3. Разгарнуць работу па перадачы абсталяваньня, якое не скарыстоўваецца на прадпрыемствах, школам ФЗС, для організацыі майстэрняў і лябораторый, дзеля чаго паставіць пытаньне перад ВСНГБ аб дачы дырэктыў усім гаспадарчым органам аб садзейнічаньні ў правядзеньні гэтага мерапрыемства.

4. Лічыць неабходным у больш буйных вытворчых цэнтрах organізаваць раённыя лябораторыі па абслугоўваньню ФЗС. Даручыць аддзелу адукацыі і быту ЦК разам з НК Асьветы распрацаваць практычныя мерапрыемствы ў гэтым напрамку

5. На буйных прадпрыемствах, дзе маюцца ФЗС, організаваць навучальныя цэхі з тым, каб забясьпечыць імі праходжаньне вытворчай практыкі старэйшымі групамі ФЗС. Аддзелу адукацыі і быту, разам з НК Асьветы, вызначыць колькасьць прадпрыемстваў, пры якіх павінны быць організаваны такія цэхі.

6. У зьвязку з адсутнасьцю належных падрыхтаваных педагогічных кадраў для ФЗС і ШКМ, сёлета прыступіць да перападрыхтоўкі пэдкадраў сямігодак, якія пераводзяцца ў ФЗС і ШКМ, а таксама вылучыць кваліфікаваных рабочых і рабочую моладзь у якасьці інструктароў, прапусьціўшы іх праз адпаведныя курсы.

7. Заключыць умову між НК Асьветы, ВСНГ, Наркамземам, Колгасцэнтрам, ЦСПСБ і ЦК аб сумеснай рабоце па політэхнізацыі школы. Аддзелу адукацыі і быту забясьпечыць выкананьне гэтай дырэктывы да політэхнічнага зьезду.

8. Прапанаваць ЦБДКА распрацаваць мерапрыемствы па ўдзелу піонэрорганізацыі ў падрыхтоўцы да Ўсебеларускага політэхнічнага зьезду.

9. Рэдакцыю газэты „Чырвоная Зьмена“ асьвятляць пытаньне політэхнізацыі і падрыхтоўкі да зьезду і ўдзел у гэтай рабоце комсамольскай організацыі.

Бяз ведама і ўдзелу мас

„Наркамасьветы хадайнічае“...

„Гэтым НКА хад йнічае аб уключэньні ў прамфінплян з воду „Чырвоны Кастрычнік“, Аршанскай акругі 20.000 рублеў на пабудову і абсталяваньне на з водзе навучальна-паказальнага цэху для сямігодкі“...

Вось і усё. Больш ніякіх матар'ялаў і дакумантаў аб прымацаваньні сямігодак да фабрык, заводаў, колгасаў і савгасаў аддзел кадраў ВСНГ Беларусі ня мае.

15-га верасьня г. г. павінен адбыцца першы ўсебеларускі політэхнічны зьезд. Зьезд павінен будзе абгаварыць стан політэхнізацыі на Беларусі і вызначыць далейшыя крокі яго разьвіцьця.

Асновай політэхнізацыі зьяўляецца зьліцьцё школы сямігодкі з фабрыкай, стварэньне такой навучальнай адзінкі, якая была-б здольна сапраўды падрыхтаваць патрэбныя кадры для нашай растучай соцыялістычнай вытворчасьці.

У сувязі з гэтым, паўстае пытаньне аб уключэньні ў прамфінпляны нашых заводаў і фабрык на трэці год пяцігодкі пэўнае колькасьці сродкаў на стварэньне і абсталяваньне спэцыяльных цэхаў для гэтых школ.

Праз 24 дні нашы заводы і фабрыкі, савгасы і колгасы павінны прыступіць да выкананьня прамфінпляну 3-га году пяцігодкі.

Казёл адпушчэньня—раён

А ВСНГБ мае толькі адзін вышэй паданы дакумант. Толькі да заводу **„Чырвоны Кастрычнік“** прымацавана сямігодка, а да астатніх?..

... а да астатніх Наркамасьветы даў дырэктывы гарадом. **Раёнам дырэктывы ня ладзены.** Тут, бачыце, вінаваты ўжо не Наркамасьветы, а ліквідацыя акруг, бо НКА дасылаў дырэктывы акругам, дык хто-ж вінаваты ў тым, што яны ліквідаваліся?

Такім чынам, Менскі гарадзкі інспэктар Нарасьветы тав. **Парук** да сёньняшняга дня ўсё яшчэ займаецца прымацаваньнем школ да прадпрыемстваў, а калі яны будуць прымацаваны—невядома.

Тут паўстае яўная пагроза зрыву ўсяе працы па політэхнізацыі на гэты год.

Тэмпы НКАсьветы прывядуць да таго, што ВСНГ і астатнія гаспадарчыя організацыі ня змогуць унесьці ў прамфінпляны заводаў і фабрык, савгасаў і колгасаў належную колькасьць сродкаў на абсталяваньне і пабудову школ політэхнічнай асьветы, чым паставяць пад удар усю работу па політэхнізацыі школ.

ВСНГБ таксама спакойна склала зброю і чакае пакуль НКА прышле сьпіс прымацаваньня. Рашучых крокаў для ажыцьцяўленьня ўсёй гэтай працы ВСНГ ня прымаў. **І толькі зараз аддзел кадраў пасылае на імя т. Платуна адносіну з патрабаваньнем даслаць весткі аб прымацаваных да фабрык не пазьней 8-га верасьня.**

Напярэдадні Ўсебеларускага політэхнічнага зьезду



Замест падрыхтоўкі—балбатня і жангліраваньне ...татамі

Замешанасьць і паніка замест падрыхтоўкі

Ва ўсёй працы па політэхнізацыі і ў паўрыхтоўцы да зьезду адчуваецца нейкае замяшанасьць і паніка. Наркамасьветы нічога ня ведае аб ходзе падрыхтоўкі і працы ў раёнах. ВСНГБ чакае ад Наркамасьветы сьпісаў. НКА скідае ўсю віну на „об'ектыўныя“ прычыны і ЦСПСБ, а наогул ва ўсім гэтым гармідары адчуваецца толькі папяровае жыцьцё і ня больш.

Ня гледзячы на тое, што да зьезду засталося ўсяго 9 дзён, тэзісы дакладаў яшчэ ня складзены і **ніводная організацыя конкрэтна ня ведае з чым яна прыдзе на зьезд.** Загадчык аддзелу кадраў ВСНГБ т. **Табайнік** да гэтага часу сваіх тэзісаў ня склаў і мяркуе, што авось **да 8 верасьня тэзісы як-небудзь самі складуцца.**


Грамадзкае думкі вакол зьезду ня ўзьнята. Скліканая НКА нарада культкамісій, фабзавмясцкомаў прайшла надзвычайна вяла. Толькі за ўвесь час на адным прадпрыемстве быў зроблен даклад аб зьезьдзе і задачах політэхнізацыі. Лёзунгі і плякаты да гэтага часу яшчэ ня выпушчаны.

Усё гэта сыгналізуе небясьпеку, што справа політэхнізацыі на бліжэйшы час можа быць **сарвана** ды і сам зьезд пры такой да яго падрыхтоўцы, калі кожная організацыя і ўстанова скідае віну за кепскую падрыхтоўку адна на адну, можа прайсьці бяз удзелу і падрыхтоўкі мас.

Гэтую пагрозу трэба папярэдзіць.

Л. Глезэр.

Па шляху падрыхтоўкі кадраў



Хроніка падрыхтоўкі да Ўсебеларускага зьезду політэхнізацыі школ

* 1-га верасьня ЦСПСБ праведзена агульна-гарадзкая нарада Менску старшынь фабзавмясцкомаў з дакладам Наркамасьветы аб політэхнізацыі школ.

* Для абслугоўваньня сходаў рабочых колгасьнікаў і савгасьнікаў, прысьвечаных абгаварэньню пытаньняў політэхнічнага зьезду, вылучана 30 чалавек, з якіх 15—для абслугоўваньня Менску, а астатнія будуць пасланы ў раёны.

* Пачалі працаваць спэцыяльныя курсы настаўнікаў фабрычна-заводзкіх сямігодак. На курсах абмяркоўваюцца конкрэтныя пытаньні і шляхі політэхнізацыі школ. У раёнах вызначана правесьці асьветніцкія курсы конфэрэнцыі па гэтым-жа пытаньні.

* Перад гаспадарчымі організацыямі пастаўлена пытаньне аб прымацаваньні 7-годак да фабрык і заводаў, савгасаў і колгасаў.

* * *

Характэрна, што ніводнае з гэтых мерапрыемстваў, за выключэньнем сходу старшынь фабзавмясцкомаў, у жыцьцё не праведзена. Таварышы, што вылучаны на абслугоўваньне сходаў па політэхнізацыі, да работы не прыступілі. Адсюль відаць усю нікчэмнасьць плянаў і пастаноў, раз яны шпарка не пераключаюцца ў конкрэтныя справы.

С.

Усе на праверку выкананьня ўвядзеньня ўсеагульнага навучаньня

Пасьпяховае зьдзейсьненьне ўсеагульнага абавязковага навучаньня „будзе найвялікшай перамогай ня толькі на культурным, але і на палітычным і гаспадарчым франтох“ (Сталін).

Ня гледзячы на ўсю важнасьць гэтага пытаньня, на мясцох ёсьць палітычная недаацэнка ўвядзеньня ўсеагульнага абавязковага навучаньня, у сувязі з чым гэта работа ня прыняла баявога характару і ня стала асноўнай і важнейшай задачай ва ўсёй рабоце органаў Нарасьветы. Дзякуючы гэтаму ў рабоце па ўвядзеньню ўсеагульнага абавязковага навучаньня назіраецца маруднасьць, ведамсьцьвенная замкнутасьць, адсутнасьць грамадзкасьці і масавасьці ў рабоце, што яўна пагражае зрывам важнейшай дырэктывы партыі і ўраду аб увядзеньні ўсеагульнага абавязковага навучаньня.

Выходзячы з вышэйпаданага, НКА БССР, сумесна з ЦК ЛКСМБ і ЦП саюзу працасьветы, з 5 па 20 **верасьня г. г. на тэрыторыі БССР абвяшчаецца 2-хтыднёвік праверкі выкананьня пастановы СНК БССР па ўвядзеньню ўсеагульнага абавязков. навучаньня.**

2-хтыднёвік ставіць сваёй мэтаю: праверыць на мясцох, што конкрэтна зроблена ў адносінах правядзеньня ўсёй падрыхтоўчай работы да ўвядзеньня ўсеагульнага навучаньня; як практычна ажыцьцяўляецца пастанова па ахопу ўсіх дзяцей 8-10-гадовага ўзросту школамі 1-га концэнтру, а ў гарадзкіх і фабрычна-заводзкіх паселішчах—дзяцей рабочых 5-мі групамі 7-хгодак і пераросткаў ад 11-15 гадоў; што яшчэ трэба конкрэтна зрабіць для поўнага ажыцьцяўленьня пастановы СНК; выявіць колькі дзяцей абавязковага ўзросту засталося па-за школай і высьветліць прычыны ненаведваньня імі школы; як праведзена падрыхтоўка да адчыненьня новых школьных комплектаў і як забясьпечаны школы памяшканьнямі, інтэрнатамі (начлежкамі) і школьнай мэбляй; праверыць забясьпечанасьць школ настаўнікамі і дакладна выявіць лік недастаючых настаўнікаў, праверышы адначасова правядзеньне агітацыйна-масавай растлумачальнай працы сярод рабочых батракоў, колгасьнікаў, беднякоў і сераднякоў па пытаньню ўвядзеньня абавязковага навучаньня, і давядзеньня пастаноў партыі і ўраду да працоўных мас.

Кіраўніцтва 2-хтыднёвікам ажыцьцяўляецца праз асобную тройку, якая павінна быць для гэтай мэты створана ў складзе: прадстаўніка РВК, альбо Гарсавету (старшыня), прадстаўніка РК ЛКСМБ і прадстаўніка профорганізацыі.

Галоўнымі момантамі работы камісіі павінны быць:

1) Тройка правярае работу камітэтаў садзейнічаньня ўвядзеньню ўсеагульнага навучаньня пры РВК, гарсаветах і сельсаветах.

2) Праз камітэты садзейнічаньня ўвядзеньню ўсеагульнага навучаньня праводзіць агітацыйна-масавую растлумачальную работу сярод шырокіх працоўных мас і ў першую чаргу на прадпрыемствах, у савгасах і колгасах з мэтай популярызацыі пастаноў партыі і ўраду па ўсеагульнаму абавязковаму навучаньню.

3) 2-х тыднёвік правесьці пры актыўным і шырокім удзеле комсамолу, саюзных і ўсіх грамадзкіх організацый, шляхам утварэньня паасобных сходаў, вечароў, дакладаў і інш., ужываючы, як галоўны мэтад ва ўсёй рабоце,—спаборніцтва, організацыю брыгад лёгкай кавалерыі і інш. Усе мерапрыемствы павінны быць накіраваны на стварэньне такіх умоў, пры якіх ні адно дзіця абавязковага ўзросту не засталося-б па-за школай.

4) Важнейшай работай 2-х тыднёвіку павінна быць організацыя фондаў беднаты для забясьпечаньня дзяцей беднаты вопраткай, абуткам і іншымі рэчамі, для чаго на мясцох зараз-жа патрэбна прыступіць да збору гэтых сродкаў і заключэньня дагавароў праз камітэты садзейнічаньня з гаспадарчымі профсаюзнымі організацыямі па забясьпечэньню вопраткай і грашыма.

5) Усю праводзімую работу, як па 2-х тыднёвіку, так і па ўвядзеньні ўсеагульнага навучаньня неабходна шырока асьвятліць у мясцовым і цэнтральным друку і насьценгазэтах, даючы аб ходзе 2-х тыднёвіку зьвесткі і матар‘ялы ў Наркомасьветы.

6) Для дапамогі ў правядзеньні 2-х тыднёвіку з боку Наркомасьветы, ЦК комсамолу, Саюзу Працасьветы на месцы накіроўваюцца работнікі.

Нарком Асьветы **Платун.**
ЦК ЛКСМ **Гайдукевіч.**
ЦПС Працасьветы **Рычкоў.**

Абмежаваліся толькі цыркулярамі

Прадстаўнік НКА увёў у зман прадстаўніка газэты „Савецкая Беларусь“. У зьмешчаным артыкуле паданы былі няверныя весткі аб укомплектаваньні Слуцкага Пэдтэхнікуму. Пэдтэхнікум залічылі было на першае месца па ліку паданых заяў, тады як справа ўкомплектаваньня пастаўлена там надзвычайна дрэнна. На 54 месцы па курсы рабочых падана толькі 1 заява. На падкурсы патрэбна—75 заяў ад рабочых, а падана таксама адна.

Трэба адзначыць, што НКА наогул вельмі мала клапоціцца аб укомплектаваньні пэдустаноў. Пакульшто справа абмежавалася толькі цыркулярамі. Дагэтуль неапублікавана пастанова аб падвышэньні стыпэндыі студэнтам пэдустаноў, не апублікаваны нормы прыёму, ня створана грамадзкая думка навокал пастановы ЦК УсеКП(б) аб палепшаньні матар‘яльнага становішча вясковага настаўніцтва.

А чаго варты даведчык, выданы НКА! Вазьмеце некалькі экзэмпляраў і параўнайце весткі аб пэдустановах. У адным з іх прачытаеце што ў Слуцкі і Рэчыцкі пэдтэхнікумы зусім няма прыёму.

Г. Д.

Выканаць заданьні па хлебазагатоўках

500 ПУДОЎ ЗБОЖЖА—ДЗЯРЖАВЕ

Сялянства в. Русакі, Грэскага раёну, сабраўшыся на сход 21-га жніўня пастанавіла здаць дзяржаве 500 пудоў збожжа. З боку кулацтва было супраціўленьне. А бедната дала ім рашучы адпор.

А. Паваротны

ПАДРЫХТАВАЛІСЯ!

Рогаўскі с-с Заслаўскага раёну разам з партыйна-комсамольскімі ячэйкамі ў свой час ставілі пытаньне аб хлебазагатоўках. Прысланыя ў сельскія саветы кантрольныя лічбы, камісія разьмеркавала па вёсках. Лічбы гэтыя былі зацьверджаны на групах беднаты, 19-га жніўня склікалі ўвесь актыў Рогаўскага сельсавету, дзе дэталёва прапрацоўвалі гэтае пытаньне. Кожнага актывістага прымацавалі да асобнае вёскі. Выбралі два ссыпных пункты ў Рогаве і савгасе «Комунар“. Вызначаны людзі для прыйма збожжа. На гэтай нарадзе была асабліва завострана ўвага і на тым, каб разам з правядзеньнем работы па хлебазагатоўках і пасеўкампаніі працягваць упарта работу па колектывізацыі, па загатоўцы мяса, контрактацыі жывёлы і пасеву.

АСОТ.

Мопраўцы—актыўныя ўдзельнікі хлебазагатовак

Сход Менскага профактыву, які адбыўся гэтымі днямі, вынес пастанову аб неабходнасьці мобілізаваць сілы МОПР‘аўцаў для ўдзелу ў хлебазагатоўчай кампаніі. На гэтым сходзе Гомельскі Акругком МОПР у выклікаў Менскую МОПР—організацыю на соцыялістычнае спаборніцтва. Умова ўжо заключана, і цяпер наступіў час дзейнічаць.

ЦК МОПР БССР чакае ад лепшых і буйнейшых МОПР‘аўскіх організацый Менску і Гомелю праяўленьня максымуму ініцыятывы і самадзейнасьці на фронце хлебазагатовак.

Менская і Гомельская МОПР-організацыі знойдуць даволі сіл для пасьпяховага правядзеньня баявой кампаніі.

Партыя, савецкая ўлада і ўся наша савецкая краіна заклікае ўсю грамадзкасьць прыняць актыўны ўдзел у хлебазагатоўках. Гэты заклік павінен знайсьці і знойдзе шырокі водгук у шэрагах МОПР‘у.

Безадкладна распрацаваць опэрацыйны плян, мобілізаваць людзей з ліку МОПР-актыву і кінуць іх ... вёску на хлебазагатоўкі—вось ... вая задача.

МОПР‘аўцы ва ўдарным пар... за справу!

ЦК МОПР БССР, Кастрычніцкі і Фрунзэўскі райкомы МОПР‘у зы... таюцца да ўсіх МОПР‘ячэек го... вызначыць ударныя брыгады на ... памогу ў правядзеньні хлеба... тоўчай кампаніі.

Сродкі адпусьцілі... але нічога не зрабі...

У в. Таўкачэвічы, Шацкага ... (Пухавіцкі р-н) ёсьць чатыр... довая школа. Школе патрэбен ... пітальны рамонт. На гэтую спр... ўжо адпушчаны сродкі. Патр... толькі матар‘ялы, аб якіх па... быў своечасова паклапаціцца р... ны інспэктар Нарасьветы. Чаму ... да гэтага часу ён яшчэ нічога ... зрабіў. Навучальны год у ... вёсцы-пад пагрозаю зрыву.

І. П...

МОБІЛІЗАВАЛІ НА... БІРЖУ ПРАЦЫ

Да адказнасьці вінаватых у агіднай цяганіне

Усяго нас было 30. Сабраліся мы з розных гарадоў: адны з Барысава, другія з Бабруйску, трэція з Менску. Гэта было 15-га лютага.

Па мобілізацыі ЦК ЛКСМБ мы прыехалі ў Менск з тым, каб запоўніць шэрагі рабочых будаўнікоў, якіх не хапала для пачатку будаўнічага сэзону.

Холадна сустрэў нас Менск. Накіравалі ў казармы—баракі, дзе мы знаходзіліся 3 месяцы.

Адразу па прыезьдзе нас паслалі ў ЦІП. Хлопцы з рознымі профэсіямі пачалі перакваліфікоўвацца. У ЦІП‘е мы атрымоўвалі, замест абяцанай пэнсіі, па сярэднім разьліку—50 рублёў у м-ц і не болей.

У ЦІП‘е мы прапрацавалі 3 месяцы. Скончылі. Бязумоўна, што ЦІП, як гэткі, ня здолен быў даць нам патрэбную кваліфікацыю і па сканчэньні курсаў мы ня здольны былі самі працаваць на пабудове. Узялі інструктара, які таксама быў падрыхтаван ЦІП‘ам на спэцыяльных курсах. Плацілі па 200 рублёў у месяц. У чэрвені, калі нас звольнілі з-за недахопу будаўнічых матар‘ялаў, пры разьліку нам выплацілі па... 40 кап. у дзень.

Пасьля гэтага Менбудтрэст накіраваў нас на чорную працу на цагельныя заводы. Мы не пажадалі і адмовіліся ісьці туды.

Засталіся бяз працы. Пайшлі па ўстановах хадайнічаць. Сродкаў для жыцьця ня было. Калі пытаньне аб гэтым дайшло да ЦК КП(б)Б, ЦК вынес пастанову аб аднаўленьні нас на працу пры старых умовах з тым, каб мы маглі працягваць сваю кваліфікацыю. Разам з тым прапанована заплаціць нам за вымушаны прагул.

Тав. Андзэў, дырэктар Менбудтрэсту, сустрэў нас „надзвычайна прыемна“. Перш за ўсё, калі ён даведаўся аб пастанове ЦК, ён далікатна назваў нас „падлецамі і рвачамі“. Замест 25 прагульных дзён заплаціў за 16, а ўсё-ж аднавіў на працу.

Пасьля двух месяцаў працы нас накіравалі ў водпуск, а калі мы вярнуліся з гэтага незаконнага водпуску, дык ізноў засталіся бяз працы, бо нас звольнілі.

Кропка. Вось наш шлях, шлях мобілізаваных на будаўніцтва, пачынаючы з 15-га лютага да гэтага дня.

Паўстае пытаньне: **Што мы далі нашаму будаўніцтву? Для чаго нас адарвалі ад вытворчасьці, ад фабрык і заводаў і паслалі ў ЦІП і на біржу Працы?**

Гэтыя пытаньні павінны знайсьці адказ. Адначасова з гэтым мы пытаемся, што будзе з намі, маладымі рабочымі, адарванымі ад сваёй вытворчасьці і апынуўшыміся на біржы Працы?

Усе гэтыя пытаньні чакаюць адказу. На іх павінны адказаць організатары мобілізацыі і кіраўнікі ЦІП‘у, якія здолелі падрыхтаваць толькі чорнарабочых а не кваліфікаваных рабочых і ўсе вінаватыя ў гэтай агіднай цяганіне. **Рубінчык.**

Ліст у рэдакцыю

Супроць літаратурнага крадзяжу

Паважаны тав. рэдактар!

Просім зьмясьціць у вашай газэце наступнае:

У № 4 „Полымя“ за 1930 г. быў зьмешчаны наш пераклад з поэмы У. У. Маякоўскага „Хорош...“. У перакладзе былі гэткія радкі (падаем без разьбіўкі):

„... на могілках гэтых, часамі здаецца—та арышаў мучыць атрута трывогі: па попелу ходзіць, па костках ліецца, выходзіць на сьвет па квяцістых дарогах і шум па дарогах трывогай імкнецца—скажэце—вы тут? У барацьбе ня прысталі? Ці йдзеце наперад? За працаю ўсе вы? Даробіць комуну з сьвятла і са сталі рэспублікі вашай сучасны насельнік? Ціха, таварышы, сьпеце...“ і г. д.

Праз чатыры месяцы, у № 6-7 „...ладаяка“ Я. Вазёрны выдрукаваў ... му „Пойдзем ліпнёвым маршам“, ... якой знаходзім гэткія радкі:

„Здаецца... на могілках бра... хаваных катуе... моцнай трывогі ... рута...—пэ‘рых авацца—звон... вадлы. Усёткі радасьць пер... смутку. Кветкі на могілках ціха ... стаюць:—дзе вы? Скажэце! Ня ... фарпосты? Комуны будуеце з ... сталі?.. Сьпіце с акойна...“

Комэнтарыяў ня трэба.

Мы абвінавачваем Язэпа Ва... ў літаратурным крадзяжы, пра ... даводзім да ведама грамадзтва.

Юлі Таў...
Зьмітрок Астап...

Менск, 1-IX-30 г.

ПАВЕДАМЛЕНЬНІ

20-га верасьня а 12 гадзіне раніцы ў памяшканьні Дому Працасьветы пачне працаваць конфэрэнцыя працаўнікоў дзіцячых дамоў, на якую НКА просіць выдзяліць свайго прадстаўніка.

Камісія па скліканьню конфэрэнцыі.

Рагачоўская профтэхшкола дрэваапрацоўшчыкаў паведамляе, што прыём заяў прадоўжаны да 15-га верасьня 1930 г. Прымаюцца асобы, якія скончылі сямігодку. Прынятыя ў профшколу забясьпечваюцца стыпэндыяй і агульным памяшканьнем да 70%.

ДОМ КОМАСЬВЕТЫ:—7-IX а 7-ай гадзіне ўвечары адбудзецца вечар комсам. і парт. актыву, прысьвечаны МЮД‘у. Пасьля дакладу мастацкая частка. Білеты па РК КП(б)Б.

25-га верасьня г. г. у Менску адбудзецца усебеларуская Конфэрэнцыя працаўнікоў дзіцячых дамоў. Вам неабходна камандыраваць на конфэрэнцыю работнікаў дзіцячых дамоў.

Конфэрэнцыя працягнецца з 25-га а 29 верасьня ўключна. Будуць абгаворваны наступныя пытаньні:

1. Рэконструкцыя народнай гаспадаркі і задачы народнай асьветы.
2. Дзіцячы дом і далейшыя яго перспэктывы.
3. Ахова здароўя дзяцей.
4. Формы політэхнізацыі у Д-Д.
5. Грамадзкасьць у барацьбе з прыгульнасьцю і безнагляднасьцю дзяцей.
6. Пэдолёгічная работа ў Д-Д.

Даклады па сэкцыях.

а) Дзеткомрух і яго формы ... б) пазашкольная работа ў Д-Д; в) ... тады работы ў Д-Д; г) удзел ... му ў соцспаборніцтве і ўдар...; д) інтэрнацыянальнае і антырэлігійнае выхаваньне; е) мэтады работы з ... нымі дзецьмі; ж) роля Камансаму ... ве дзяцінства.

Конфэрэнцыя пачнецца 25-га верасьня а 10-ай гадз. раніцы ў ... Працасьветы.

Інспэктар НКА Сянькевіч

Адказны рэдактар— Рэдколегія

4 ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА № 206 (1173)

Менск, друкарня БДВ імя тав. Сталіна

Галоўлітбел № 599